*В.В.Якімцова*

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА СПЕЦЫЯЛІСТАЎ: ПРАБЛЕМА ВЫЯЎЛЕННЯ ЗМЕСТУ

Развіццё новых інфармацыйных тэхналогій, пераход да інфармацыйнага грамадства абумовілі станаўленне феномена інфармацыйнай культуры, якая сёння з'яўляецца неабходнасцю для паспяховай дзейнасці ў кожнай сферы, неад'емнай часткай прафесіяналізму спецыяліста любога профілю.

Інфармацыйная культура спецыялістаў з'яўляецца даволі складанай, шматаспектнай сістэмай са мноствам структурна-зместавых элементаў. Аднак праблема зместу інфармацыйнай культуры спецыялістаў недастаткова распрацавана. Даследчыкі (В.Л.Бугрова, М.Г.Вохрышава, Н.Б.Зіноўева, Л.К.Лабадзенка, Н.В.Агурцова і інш.) не маюць адзінага пункту гледжання па гэтым пытанні. Змест інфармацыйнай культуры спецыялістаў знаходзіцца ў стадыі распрацоўкі. У якасці яе асноўных структурна-зместавых элементаў мы прапаноўваем разглядаць:

– светапоглядную культуру, якая садзейнічае фарміраванню інфармацыйнага светапогляду спецыяліста, што ўяўляе сабой бесперапынны працэс засваення аб'ектыўных навуковых ведаў і выпрацоўкі на аснове іх аналізу ўласных поглядаў, перакананняў і ідэалаў. Інфармацыйны светапогляд дапамагае ўсведамленню спецыялістамі свайго месца і ролі ў новым, інфармацыйным грамадстве;

– маральную культуру, якая садзейнічае фарміраванню асабістай і прафесійнай адказнасці спецыяліста, яго свядомасці, звычак, звязаных з нормамі, правіламі і патрабаваннямі ў розных сферах жыцця і дзейнасці. Гэта перашкаджае распаўсюджванню і выкарыстанню інфармацыі ў сацыяльна-дэструктыўных мэтах, распаўсюджванню дэзінфармацыі ў прафесійным асяроддзі і грамадстве ў цэлым;

– інфармацыйна-прававую культуру, якая рэгулюе інфармацыйную дзейнасць спецыяліста як спажыўца, вытворцы і распаўсюджвальніка інфармацыйных рэсурсаў пэўнай галіны ведаў праз выкананне ім законаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нарматыўных актаў, нормаў інфармацыйнага права, звязаных са свабодай і абмежаваннем доступу да інфармацыі, яе стварэннем і распаўсюджваннем;

– псіхалагічную культуру, спрыяючую выпрацоўцы аптымальнай рэакцыі спецыяліста на новую інфармацыю, яе адэкватнаму ўспрыманню, асэнсаванню, разуменню, ацэнцы, фарміраванню звычак прадуктыўна дзейнічаць ва ўмовах дэфіцыту ці лішку неабходнай інфармацыі;

– камунікатыўную культуру, якая садзейнічае развіццю культуры інфармацыйных адносін у прафесійным і грамадскім асяроддзі, выкарыстанню фармальных і нефармальных каналаў камунікацыі для перадачы прафесійнай і іншых відаў інфармацыі і абмену вынікамі дзейнасці з калегамі;

– лексічную культуру, што садзейнічае ўдасканаленню культуры пісьма і афармлення спецыяльнай дакументацыі, фарміраванню прафесійнай і агульнанавуковай тэрмінасістэмы спецыяліста, разуменню і выкарыстанню ім неабходных аўтарскіх тэкстаў;

– бібліяграфічную культуру, накіраваную на рэгуляванне, сістэмаарганізацыю, упарадкаванне звестак аб дакументах, якія ўключаюцца ў інфармацыйнае поле спецыяліста;

– кніжную, чытацкую культуру, якая дапамагае фарміраваць культуру чытання спецыяліста, накіраваную на выбар, адбор, успрыманне твораў друку, удасканальванне тэхнікі чытання;

– інтэлектуальную культуру, што садзейнічае развіццю мыслення, пазнавальных асаблівасцей спецыяліста, здольнасці па-майстэрску выкарыстоўваць уласныя веды ў жыцці і знаходзіць рашэнні ў новых сітуацыях, а таксама фарміраванню культуры навуковага даследавання і разумовай працы;

– інфармацыйна-тэхналагічную культуру, накіраваную на ўдасканальванне культуры выкарыстання спецыялістам сучасных інфармацыйных тэхналогій і аўтаматызаваных сродкаў.

Тым не менш змест інфармацыйнай культуры спецыялістаў рознага профілю (прыродазнаўча-навуковага, навукова-тэхнічнага і сацыягуманітарнага) мае свае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асаблівасці. На змест інфармацыйнай культуры істотна ўплываюць спецыфіка прафесійнай дзейнасці, прафесійныя інфармацыйныя патрэбнасці спецыяліста.

Структурна-зместавыя элементы інфармацыйнай культуры спецыялістаў узаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены. Перавага якіх-небудзь з іх негатыўна адбіваецца на агульным стане інфармацыйнай культуры спецыяліста. Так, дамінаванне бібліяграфічнага элемента пры адсутнасці, напрыклад, кніжнага, лексічнага і інтэлектуальнага значна збядняе яе змест. Перавага ж інфармацыйна-тэхналагічнага элемента з акцэнтам на камп'ютэрную пісьменнасць і культуру выклікае яшчэ большую небяспеку, таму што неразвітасць светапогляднай, маральнай, інфармацыйна-прававой культуры пры наяўнасці тэхналагічных ведаў прыводзіць да выкарыстання спецыялістам гэтых ведаў і ўменняў у сацыяльна-дэструктыўных мэтах. Усе зместавыя элементы інфармацыйнай культуры спецыялістаў з'яўляюцца аднолькава значнымі і павінны займаць раўнацэннае становішча ў яе структуры. Дапаўняючы адзін аднаго, яны садзейнічаюць гарманізацыі ўзаемадзеяння спецыяліста з навакольнай інфармацыйнай прасторай. Такім чынам, актуальнай задачай з'яўляецца падрыхтоўка спецыялістаў з высокім узроўнем інфармацыйнай культуры.

На працэс яе фарміравання ўплывае цэлы рад фактараў. Сярод іх вылучаюцца такія, як прыналежнасць да пэўнай прафесіі, статус спецыяліста ў грамадстве і ў сваім прафесійным асяроддзі, псіхафізіялагічныя асаблівасці і асобасныя якасці спецыяліста, узровень выхавання і адукацыі, канкрэтна-гістарычныя ўмовы развіцця пэўнага грамадства і пэўнай прафесійнай сферы і інш.

Узровень інфармацыйнай культуры шмат у чым залежыць і ад актыўнасці інфармацыйнага ўзаемаабмену спецыяліста з наваколлем. Так, калі ў яго інфармацыйным полі невялікі аб'ём інфармацыі і інтэнсіўнасць абмену ёю са знешнім асяроддзем нізкая, то няма і функцыянальнай патрэбы ў навуковых даследаваннях, выкарыстанні сучасных інфармацыйных тэхналогій, у інфармацыйна-прававых ве-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дах. У гэтым выпадку механізм рэгулявання ўзаемаадносін з навакольным светам, успрыманне інфармацыі паўстаюць у спрошчаным варыянце. Значыць, нізкі ўзровень інфармацыйнай культуры характарызуецца несфарміраванасцю некаторых яе структурна-зместавых элементаў. У той жа час высокая інфармацыйная культура спецыялістаў уключае ўвесь аб'ём структурных элементаў і вызначаецца найвышэйшым іх развіццём.

Па меры росту прафесіяналізму, пашырэння і ўскладнення ўласнага інфармацыйнага поля спецыяліст непазбежна сутыкаецца з патрэбнасцю рацыяналізаваць працэс узаемадзеяння з інфармацыйным асяроддзем, дасягнуць адпаведнага ўзроўню сваёй інфармацыйнай культуры і ўздзейнічаць на аптымізацыю інфармацыйнага асяроддзя.

Такім чынам, інфармацыйная культура спецыялістаў вызначаецца дастатковай складанасцю і шматграннасцю сваёй зместавай структуры. Яна мае міжгаліновы характар, бо ўключае комплекс светапоглядных, маральна-прававых, інтэлектуальна-псіхалагічных, інфармацыйна-камунікатыўных, лексічных, бібліятэчна-бібліяграфічных праблем, рэалізацыя якіх будзе садзейнічаць гарманізацыі ўнутранага свету спецыяліста, устанаўленню раўнавагі з навакольным інфармацыйным асяроддзем і ў выніку – павышэнню яго прафесійнай кампетэнтнасці і сацыяльнай актыўнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ